# 1921 35 год на карысць

## ЦЁПЛЫЯ ЎСПАМІНЫ

Восенню 1923 года споунілася мая запаветная мара—я пастуніла на медыцынскі факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэты дзень быу для мяне вялікім святам. Я была шчаслівай і здавалася, што шчасцю майму няма канца.



Памятаю першы урачысты сход студэнтау, якія паступілі ва універсітэт, памятаю выступленне на ім рэктара універсітэта прафесара Пічэты. Ён пазнаёміу нас з тымі вялікімі задачамі, якія стаялі перад моладдзю, паступіушай у ВНУ.

Перада мной расчыніліся шырокія дзверы авалодання ведамі. Тады-ж я дала сабе слова—рабіць усё, каб стаць сапраўдным спецыялістам. Слухаючы лекцыі, я імкнулася пранікнуць у кожнае слова выкладчыка.

Мяне выбралі членам прафкома медыцынскага факультэта, членам бюро комсамольскай арганізацыі універсітэта, а таксама членам бюро комсамольскай арганізацыі медыцынскага факультэта. Потым я стала сакратаром комсамольскай арганізацыі медыцынскага факультэта.

Хутка праляцелі пяць год вучобы. Год заканчэння быу у маім жыцці асабліва знамянальным—у гэтым-жа годзе я уступіла у рады Комуністычнай партыі.

Універсітэт выхавау мяне не толькі спецыялістам, ён прывіу любоу да навуковай работы. Яшчэ будучы студэнткай, пад уплывам прафесароу і работнікау кафедры вочных хвароб я пачала наведваць клініку і цікавіцца спецыяльнай літаратурай. У сценах універсітэта мяне навучылі спалучаць вучобу з грамадскай работай. Вось чаму і цяпер, будучы прафесарам, загадчыкам кафедры вочных хвароб, я актыуна удзельнічаю у грамадска-палітычнай рабоце.

Вялікай, радаснай падзеяй было для мяне выбранне дэлегатам XX з'езда КПСС і удзел у яго рабоце.

У заключэнне я хачу адзначыць, што вучоба ва універсітэце была для мяне вялікай школай, прадпер'ем для навуковай работы. І я з вялікай удзячнасцю і любоую успамінаю тыя гады, калі я была студэнткай Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна.

**Т. В. БІРЫЧ,**
доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны урач БССР.



НА ЗДЫМКУ: Лідзія Канапляннік (злева) і Анна Асташэвіч, студэнткі 4-га курса біялагічнага факультэта, на вялікім практыкуме па сістэматыцы раслін. Ідзе вызначэнне відаў сфагнаваных імхоў.

Фото М. Пільшчыкава.

## У гасцях у акадэміка ПЕРЦАВА

Разам з усім шматлікім калектывам слаунае 35-годдзе нашага ўніверсітэта адзначае сёння і Уладзімір Нікалаевіч Перцау. Ад вучня курскага рэальнага вучылішча да доктара гістарычных навук, заслужанага дзеяча навукі, правадзейнага члена Акадэміі навук БССР—такі шлях вучонага, чыё імя зараз шырока вядома совецкім людзям.



З пытліва гледзячымі праз акуляры вачыма, па-маладому рухавы, Уладзімір Нікалаевіч ветліва і запрашальна устау нам насустрач. Рабочы стол, загружаны шматлікімі рукапісамі, гістарычнымі картамі, кнігамі, яскрава гаварыу аб тым, што гаспадар над чымсьці працавау.

Уладзімір Нікалаевіч быу у ліку першых выкладчыкау нашага універсітэта.

— Універсітэт узнікау амаль на пустым месцы,—расказвае ён.—Не было ні бібліятэкі, ні калектыва, ні выкладчыкау, ні студэнтаў. На адзінай бібліятэчнай паліцы мелася каля 15 кніг, а цяга да вучобы была вялікая...

Памятаю, у 1921 годзе ехау я з групай таварышау са Смаленска на урачыстае адкрыццё Беларускага універсітэта... Ды і спазніуся. Чаму? Бо ехалі ад Смаленка да Мінска трое сутак. Пройдзе поезд кіламетрау 20—30 і ні з месца. Праваднiца ідзе па вагонах ды і просіць: «Грамадзяне пасажыры, дапамажыце поезду крануцца». І усе выходзілі з вагонаў, папіхвалі рукамі састау.

Спачатку універсітэт размяшчауся у памяшканні комвуза па вуліцы Кірава. Было холадна, няутульна. Аднойчы зрабілі спробу ацяплення: устанавілі на гары вялізны кацёл і, награваючы ваду, хацелі ўцяпліць аудыторыі. Атрымалася так, што ў час лекцый на галавы слухачоў і выкладчыкау палілася вада, пасыпалася штукатурка...

Падрабязна, з вялікай павагай і любоўю расказвае Уладзімір Нікалаевіч аб людзях універсітэта, аб яго слаўных традыцыях, аб першым выпуску маладых спецыялістаў.

У 1934 годзе па савакупнасці шматлікіх навуковых работ Уладзімір Нікалаевіч быу удастоен вучонай ступені доктара гістарычных навук, а у 1940 годзе—выбран правадзейным членам Акадэміі навук БССР. Да гэтага часу ім былі напісаны такія кнігі, як «Гогенцолерны», «Эканамічнае развіццё Англіі у XIX веку», «Нарысы новай гісторыі XVI—XIX вякоу» «Падручнік старажытнай гісторыі», частка II-я—«Гісторыя Рыма» і многія іншыя.

Цэнтрам яго работ заусёды заставаліся гісторыя народнай гаспадаркі і праблемы гістарычнай ідэалогіі.

У 1954 годзе вышла яго кніга «Германія у XVIII веку». Акрамя таго, Уладзімірам Нікалаевічам напісаны дзесяткі навуковых артыкулау часткова у Мінскіх, часткова у Маскоускіх выданнях.

У студзені 1944 года за навуковую дзейнасць Уладзімір Нікалаевіч Перцаў узнагароджан Вярхоўным Советам СССР ордэнам Леніна, а Вярхоўны Совет БССР прысвоіу яму званне Заслужанага дзеяча навукі. У маі 1945 года ён быу назначаны Ўрадам БССР дэлегатам ад Беларусі на Канферэнцыю Аб'едналых нацый у горадзе Сан-Францыска.

У 1946 годзе Ўладзімір Нікалаевіч быу узнагароджан медалем «За доблестный труд», а праз год беларускі народ выбрау яго дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. У 1949 і 1950 гадах У. Н. Перцау двойчы удастойвауся вышэйшай урадавай узнагароды—Ордэна Леніна.

Зараз Уладзімір Нікалаевіч Перцаў працуе у нашым універсітэце загадчыкам кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоу. Нягледзячы на свае гады ён працягвае вялікую навуковую дзейнасць.

Доўгіх год жыцця вам, Уладзімір Нікалаевіч.

**П. БЕРАЖКОЎ.**

## БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Ларыса Корбут займаецца на III курсе. Сціплая, простая дзяучына, яна нічым не выдзяляецца сярод аднакурснікау. І калі мы, сустрэушы яе на адным з перапынкау каля аудыторыі, папрасілі расказаць аб сабе, яна неяк збянтэжылася, твар яе паружавеу. Прыціхшым голасам яна запытала:

— Навошта? Пісаць пра мяне у газету? Не, нятрэба. Што-ж можна пра мяне напісаць? Ніякіх вялікіх нагрузак я не нясу: не даручаюць. Займаюся на аддзяленні фізікі, вельмі люблю гэты прадмет...

У 1954 годзе Ларыса атрымала атэстат сталасці. Школа была закончана бліскуча: Ларыса атрымала залатую медаль. Пытанне аб тым, куды лепш паступіць займацца, якую спецыяльнасць атрымаць, было даўно вырашана. Ларыса жадала пайсці па слядах бацькі, стаць настаўнікам, выкладаць у школе фізіку.

...Канстанцін Давыдавіч Корбут, бацька Ларысы, таксама займауся ва універсітэце, таксама на аддзяленні фізікі. Будучы студэнтам, Канстанцін Давыдавіч аддавау усяго сябе, усю энергію маладосці, увесь энтузіязм авалоданню прафесіяй фізіка. Гэта перадалося і дочцы. У 1935 годзе бацька Ларысы кончыў універсітэт. Запаветная мара здзейснілася: ён стау педагогам. Зараз настала чарга дачкі.

...Непрыкметна падыйшла першая у жыцці Ларысы студэнцкая экзаменацыйная сесія. І тут у час экзаменаў дзяучына упэунілася, што не падвядзе бацьку, будзе займацца як і ён.

Зараз Канстанцін Давыдавіч працуе выкладчыкам школы ва Уручча.

Жыццё студэнцтва, жыццё універсітэта пастаянна горача хвалюе яго. І кожны раз, калі Ларыса прыязджае пасля лекцый дадому, Канстанцін Давыдавіч падоўгу слухае яе расказ аб тым, як выхоўваецца маладое пакаленне.

**М. ВАЦЫС.**

## НА службе НАРОДА

Узнікненне Беларускага дзяржаўнага універсітэта неразрыўна звязана з перамогай Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, з ленінскай нацыянальнай палітыкай, з клопатамі Комуністычнай партыі аб развіцці вышэйшай адукацыі у нашай краіне.

Адразу-ж пасля перамогі соцыялістычнай рэволюцыі пытанне аб адкрыцці БДУ стала на першае месца у дзейнасці КП(б)Б і мясцовых органау дзяржаўнай улады.

Развіццё народнай адукацыі, у тым ліку вышэйшай, з'явілася адным з важнейшых фактарау соцыялістычнага будаўніцтва. Праблема авалодання навукай, праблема падрыхтоўкі кадрау новай пролетарскай інтэлігенцыі станавілася адной з найбольш важных задач моманту.

Наш універсітэт пачаў-бы сваю работу у 1918 годзе, але гэтаму перашкодзіла нямецкая, а потым белапольская інтэрвенцыя.

11-га ліпеня 1921 года, у дзень гадавіны вызвалення Мінска ад белапалякау, згодна з дэкрэтам, падпісаным В. І. Леніным, аб адкрыцці у краіне раду універсітэтау і аб развіцці вышэйшай адукацыі, быў заснаваны Беларускі дзяржауны універсітэт.

Адразу-ж было прынята рашэнне прыступіць да арганізацыі факультэтаў.

Рабфак арганізавалі яшчэ да адкрыцця універсітэта. Структура рабфака была абумоулена перш за усё запатрабаваннямі дзяржавы. Ён рыхтавау кадры, больш за усё патрэбныя краіне у той момант. У сваей вучэбнай арганізацыі рабфак меу ухілы прыстасаваныя да ВНУ Беларусі: біялагічны, медыцынскі, грамадскі. У разгарнуўшайся з 1921 года барацьбе за рашучае змяненне класавага складу студэнцтва, рашучая роля належала рабочаму факультэту.

Фактычна заняткі ва універсітэце былі пачаты 30 кастрычніка 1921 года. Да гэтага часу, акрамя рабочага факультэта, які пачау сваю работу у ліпені 1921 года, былі адкрыты яшчэ тры факультэты: грамадскіх навук з аддзяленнямі прававым і юрыдычным, медыцынскі і педагагічны.

Ва універсітэт наступала абсталяванне для кабінетау і лабараторый, кнігі з Масквы, Ленінграда, Казані і іншых гарадоу краіны.

Першым рэктарам БДУ быў вядомы гісторык В. І. Пічэта. Тут-жа чыталі свае лекцыі вядомыя вучоныя—прафесары В. Н. Перцау, Н. М. Нікольскі, народны паэт БССР Якуб Колас, прафесар Прылежаеу і іншыя.

У цяжкіх умовах даводзілася працаваць. Нехапала паліва, не было электрычнасці, факультэты займаліся у памяшканнях, раскіданых па усяму гораду.

Прафесарска - выкладчыцкі склад, студэнцтва усімі сіламі імкнуліся знайсці выхад з цяжкага становішча.

У лютым 1925 года адбыуся першы выпуск маладых спецыялістау факультэта грамадскіх навук. У гэты дзень Беларусь упершыню у гісторыі свайго існавання атрымала 60 спецыялістау, выхаваных у Беларускім універсітэце.

У лютым 1927 года на III сесіі Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР было прынята рашэнне аб будаўніцтве новых карпусоу для універсітэта—універсітэцкага гарадка. Закладка новага корпуса была прыстасавана да гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. На будаўніцтва універсітэцкага гарадка Урад Беларусі адпусціу каля 8 мільёнау рублёу.

У 1930—32 гадах на базе адпаведных факультэтау універсітэта адкрыліся політэхнічны, медыцынскі, педагагічны інстытуты, інстытут народнай гаспадаркі.

У 1933—34 гадах ва універсітэце адкрылася аспірантура, праз якую былі падрыхтаваны сотні высокакваліфікаваных навуковых работнікау.

У гэты-ж час пачало сваю работу завочнае аддзяленне БДУ, якое дало магчымасць сотням грамадзян Беларусі навучацца ва універсітэце без адрыву ад вытворчасці.

У 1934 годзе ва універсітэце былі адкрыты гістарычны і геаграфічны факультэты.

З кожным годам Беларускі дзяржаўны універсітэт займау усё больш віднае месца не толькі у навуковым, але і у грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі. Да 1939 года у складзе універсітэта было 5 факультэтау: гістарычны, біялагічны, хімічны, фізіка-матэматычны і геаграфічны. У 1939 годзе быу адкрыты філалагічны факультэт з аддзяленнямі рускай мовы і літаратуры і беларускай мовы і літаратуры. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны універсітэт падрыхтавау 5.458 высокакваліфікаваных спецыялістау: гісторыкау, юрыстау, эканамістау, фізікау, хімікау, матэматыкау і г. д.

Пачалася вайна. Яна нанесла універсітэту вялікія матэрыяльныя страты у 36 мільёнау рублёу. Студэнты, прафесары і выкладчыкі універсітэта былі раскіданы па усіх гарадах Совецкага Саюза, па франтах Айчыннай вайны, па партызанскіх атрадах. Але нягледзячы на цяжкасці, у гэтыя суровыя гады БДУ аднавіу сваю работу на станцыі Сходня пад Масквой.

У 1944 годзе універсітэт пераехау у Мінск. І зноу на дапамогу універсітэту прыйшла уся краіна. Многія ВНУ дапамаглі яму абсталяваннем і літаратурай, прысылалі выкладчыкау.

З таго часу прайшло 12 год. Беларускі дзяржауны універсітэт у гэтым годзе адзначае сваё 35-годдзе.

Дзякуючы няспынным клопатам Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, ён аднавіу разбураную вайной гаспадарку, з кожным годам паляпшае сваю матэрыяльную базу.

Да 6 тысяч павялічылася колькасць студэнтау, павялічыуся выпуск высокакваліфікаваных спецыялістау.

За 35 год свайго існавання БДУ імя В. І. Леніна з гонарам выканау адказную задачу падрыхтоўкі совецкіх спецыялістау—будаунікоу новага грамадства.

**Г. А. ПАВЕЦЬЕЎ.**
прарэктар універсітэта па навуковай рабоце.

